**© Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь**
**Установа адукацыі «Рэспубліканскі інстытут кантролю ведаў»**

**УВАГА!** *Фатаграфаванне, капіраванне і распаўсюджванне тэставага матэрыялу цягне за сабой адміністрацыйную адказнасць.*

## РТ–2025/2026 гг. Этап I

## Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі

## Варыянт 1

*Варыянт змяшчае* 38 *заданняў і складаецца з часткі* А *(*16 *заданняў) і часткі* В *(*22 *заданні). На выкананне ўсіх заданняў адводзіцца* 90 *мінут. Будзьце ўважлівыя! Жадаем поспеху!*

### Частка А

*У кожным заданні часткі* А *толькі адзін з прапанаваных адказаў з’яўляецца правільным. У бланку адказаў пад нумарам задання пастаўце метку (×) у клетачцы, якая адпавядае нумару выбранага Вамі адказу.*

**А1. Формай арганізацыі людзей у першабытным грамадстве, характэрнай рысай якой было спалучэнне індывідуальнага і калектыўнага карыстання зямлёй, з’яўляецца:**

1) праабшчына;
2) племя;
3) мацярынская радавая абшчына;
4) бацькоўская радавая абшчына;
5) суседская абшчына.

**А2. Ва ўсходніх славян селянін (сяляне), які(-я) браў(-лі) у багатага чалавека пазыку і такім чынам трапляў(-лі) у залежнасць, называўся(-ліся):**

1) смерд;
2) халоп;
3) бабыль;
4) закуп;
5) «людзі».

**А3. У 1120-я гг. Ефрасіння Полацкая заснавала (узвяла) вядомы(-ую) на беларускіх землях:**

1) Спаскі манастыр;
2) Сафійскі сабор;
3) Бельчыцкі манастыр;
4) Каложскую царкву;
5) Камянецкую вежу.

**А4. Вызначце правільнае сцверджанне адносна духоўнага развіцця еўрапейскіх цывілізацый у Познім сярэднявеччы.**

1) У Познім сярэднявеччы ўплыў царквы на ўнутраныя справы дзяржавы пачаў зніжацца.
2) Літаратурныя творы гэтага перыяду ствараліся выключна на лацінскай мове.
3) У XV ст. ідэі Асветніцтва распаўсюдзіліся па ўсёй Еўропе.
4) У мастацтве Позняга сярэднявечча з’явіўся новы стыль – класіцызм.
5) З XV ст. у Еўропе пачалі адкрывацца гарадскія майстэрні па перапісванні кніг.

**А5. Паўсядзённае кіраўніцтва дзяржаўнымі справамі ў Вялікім Княстве Літоўскім (ВКЛ) у XIV–XV стст. ажыццяўлялі службовыя асобы:**
1) дружыннікі;
2) ураднікі;
3) намеснікі;
4) пасаднікі;
5) баяры.

**А6. У XIV–XV стст. у беларускім будаўніцтве вядучым(-ай) становіцца:**
1) абарончае дойлідства;
2) палацава-паркавая архітэктура;
3) барочная архітэктура;
4) гарадская архітэктура;
5) прамысловая архітэктура.

**А7. Сацыяльныя канфлікты ў гарадах ВКЛ у другой палове XVI – першай палове XVII ст. часцей за ўсё былі выкліканы:**
1) пазбаўленнем мяшчан палітычных правоў;
2) забаронай дзейнасці цэхаў;
3) злоўжываннямі і самавольствам гарадской вярхушкі;
4) павелічэннем павіннасцей на карысць феадалаў;
5) гвалтоўным перасяленнем гараджан у юрыдыкі.

**А8. У тэзісах М. Лютэра змяшчаўся(-лася):**
1) заклік да паўстання супраць князёў;
2) патрабаванне перавыбрання папы рымскага;
3) адмова з’явіцца на імператарскі суд;
4) вучэнне аб прадвызначэнні;
5) асуджэнне індульгенцый.

**А9. Прачытайце вытрымку з Канстытуцыі 3 мая 1791 г.**

«Усякая ўлада ў чалавечым грамадстве бярэ свой пачатак з волі народа. І каб цэласнасць дзяржавы, свабода грамадзян і грамадскі парадак заставаліся назаўсёды ў раўнавазе, урад народа польскага павінен складацца, і воляю сапраўднага закона заўсёды будзе складацца, з трох улад, г. зн. заканадаўчай улады ў (руках) аб’яднаных саслоўяў, вышэйшай выканаўчай улады ў (руках) караля і варты (міністраў), улады судовай у юрысдыкцыйных (органаў), якія ўсталяваны для гэтай мэты або якія маюць быць усталяваны. Сойм або аб’яднаныя саслоўі будуць дзяліцца на дзве палаты: на палату паслоў і палату сенатараў пад старшынствам караля. Палата паслоў, як адлюстраванне і ўвасабленне ўсеўладдзя народа, будзе святыняй заканадаўства».

**Выкарыстоўваючы вытрымку, вызначце правільнае сцверджанне.**
1) Прыняцце Канстытуцыі азначала пераход ад рэспублікі да манархіі.
2) Паводле новай Канстытуцыі крыніцай улады ў дзяржаве з’яўляліся кароль і міністры.
3) Канстытуцыя пацвердзіла дзяржаўнасць ВКЛ.
4) Канстытуцыя стала першай сучаснай канстытуцыяй у Еўропе.
5) Канстытуцыя ўводзіла рэспубліканскую форму кіравання ў Рэчы Паспалітай.

**A10. Для каардынацыі дзеянняў удзельнікаў паўстання 1863–1864 гг. на тэрыторыі Беларусі і Літвы быў створаны:**
1) Камітэт выратавання рэвалюцыі;
2) Камітэт па справах заходніх губерняў;
3) Цэнтральны нацыянальны камітэт;
4) Віленскі цэнтральны паўстанцкі камітэт;
5) Літоўскі правінцыяльны камітэт.

**A11. Вызначце адну з мэтаў сталыпінскай аграрнай рэформы:**
1) адмена прыгоннага права;
2) фарміраванне вясковай буржуазіі з ліку заможных сялян;
3) паляпшэнне становішча памешчыцкай вёскі;
4) павелічэнне даходнасці дзяржаўных маёнткаў;
5) стварэнне сялянскай абшчыны.

**A12. Вызначце правільнае сцверджанне адносна тэндэнцый гістарычнага развіцця заходнееўрапейскіх дзяржаў у XIX – пачатку XX ст.**
1) Адбываўся працэс ператварэння вольных земляробаў у залежных землекарыстальнікаў.
2) Адбываліся змены ў сацыяльнай структуры грамадства.
3) Пачаўся працэс першапачатковага накаплення капіталу.
4) З'явілася новая форма арганізацыі вытворчасці – мануфактура.
5) На змену саслоўна-прадстаўнічым манархіям прыйшоў абсалютызм.

**A13. Адным з мерапрыемстваў палітыкі «ваеннага камунізму» з'яўляецца:**
1) правядзенне суцэльнай калектывізацыі сельскай гаспадаркі;
2) прыватызацыя дробных і сярэдніх прадпрыемстваў;
3) прыцягненне замежнага капіталу;
4) увядзенне ўсеагульнай працоўнай павіннасці;
5) увядзенне гаспадарчага разліку на прадпрыемствах.

**A14. Нямецка-фашысцкія войскі захапілі Мінск:**
1) 22 чэрвеня 1941 г.;
2) 25 чэрвеня 1941 г.;
3) 28 чэрвеня 1941 г.;
4) 28 ліпеня 1941 г.;
5) 28 жніўня 1941 г.

**A15. Вызначце адну з характэрных рыс сацыяльна-эканамічнага развіцця БССР у другой палове 1960-х – першай палове 1980-х гг.:**
1) развіццё прыватнага прадпрымальніцтва;
2) панаванне прыватнай уласнасці ў эканоміцы;
3) механізацыя і хімізацыя сельскай гаспадаркі;
4) пераход да рыначнай эканомікі;
5) адставанне ад агульнасаюзных паказчыкаў.

**A16. Адной з характэрных рыс постіндустрыяльнага грамадства з’яўляецца:**
1) паўсюднае ўкараненне машын у вытворчасць;
2) развіццё транспарту і сувязі;
3) стварэнне фабрычна-заводскай сістэмы;
4) павелічэнне попыту на высокакваліфікаваных спецыялістаў разумовай працы;
5) механізацыя сельскагаспадарчай працы.

## Частка B

*Адказы, атрыманыя пры выкананні заданняў часткі* B*, запішыце ў бланку адказаў. Кожную літару, лічбу пішыце ў асобнай клетачцы (пачынаючы з першай) па ўзорах, пазначаных у бланку. Адказ у выглядзе слова, некалькіх слоў пішыце без прабелаў, злучка або іншых раздзяляльных знакаў.*

**B1. Устанавіце адпаведнасць.**

| Прычына | Вынік |
|---|---|
| А) распаўсюджванне земляробства на тэрыторыі Беларусі<br>Б) міграцыя найстаражытнейшага насельніцтва<br>В) узнікненне рэлігійных уяўленняў<br>Г) працаёмкасць здабывання ежы | 1) стварэнне алфавітнай пісьменнасці<br>2) распаўсюджванне найважнейшых дасягненняў чалавецтва<br>3) з’яўленне шахтаў па здабычы крэменю на захадзе Беларусі<br>4) з’яўленне пахавальных абрадаў<br>5) жыццё радавымі абшчынамі |

***Адказ запішыце ў выглядзе спалучэння літар і лічбаў, захоўваючы алфавітную паслядоўнасць літар левага слупка. Памятайце, што некаторыя даныя правага слупка могуць не выкарыстоўвацца. Напрыклад:*** **А1Б4В3Г5.**

**B2. Устанавіце адпаведнасць.**

| Дата | Падзея |
|---|---|
| А) 476 г.<br>Б) 882 г.<br>В) 1054 г.<br>Г) 1237 г. | 1) разгром шведскіх рыцараў на р. Няве<br>2) падзел хрысціянскай царквы на каталіцкую і праваслаўную<br>3) падзенне Заходняй Рымскай імперыі<br>4) пачатак мангольскага нашэсця на Русь<br>5) утварэнне Старажытнарускай дзяржавы |

***Адказ запішыце ў выглядзе спалучэння літар і лічбаў, захоўваючы алфавітную паслядоўнасць літар левага слупка. Памятайце, што некаторыя даныя правага слупка могуць не выкарыстоўвацца. Напрыклад:*** **А1Б4В3Г5.**

**B3. Вызначце тэндэнцыі палітычнага, сацыяльна-эканамічнага і духоўнага развіцця цывілізацый Еўропы і Азіі ў Раннім і Высокім сярэднявеччы:**
1) фарміраванне саслоўна-прадстаўнічых манархій у большасці еўрапейскіх дзяржаў;
2) захаванне традыцыйнага грамадства ў Азіі;
3) пачатак працэсу запрыгоньвання сялян у Заходняй Еўропе;
4) узнікненне радавой абшчыны;
5) арганізацыя крыжовых паходаў на Блізкі Усход.

***Адказ запішыце лічбамі (парадак запісу лічбаў не мае значэння). Напрыклад:*** **123.**

**В4. Вызначце характэрныя рысы развіцця культуры беларускіх зямель у IX–XIII стст.:**
1) з’яўленне жанру панегірычнай літаратуры;
2) фрэскавы роспіс у цэрквах і саборах;
3) узнікненне стылю барока ў архітэктуры;
4) існаванне вуснапаэтычнай творчасці;
5) распаўсюджванне княжацкіх пячатак.

***Адказ запішыце лічбамі (парадак запісу лічбаў не мае значэння). Напрыклад:* 123.**

**В5. Устанавіце адпаведнасць.**

| Падзея | Гістарычная асоба |
|---|---|
| А) паўстанне 1794 г. у Рэчы Паспалітай<br>Б) Паўночная вайна<br>В) казацка-сялянская вайна<br>Г) Грунвальдская бітва | 1) Ягайла<br>2) Б. Хмяльніцкі<br>3) Т. Касцюшка<br>4) Альгерд<br>5) Пётр I |

***Адказ запішыце ў выглядзе спалучэння літар і лічбаў, захоўваючы алфавітную паслядоўнасць літар левага слупка. Памятайце, што некаторыя даныя правага слупка могуць не выкарыстоўвацца. Напрыклад:* А1Б4В3Г5.**

**В6.** Прывілеяваным феадальным саслоўем у ВКЛ у XV–XVIII стст., прадстаўнікі якога валодалі зямлёй, займалі пануючае становішча ў дзяржаве і неслі вайсковую службу, з’яўлялася ________.

***Адказ запішыце словам у форме назоўнага склону.***

**В7. Вызначце характэрныя рысы развіцця рамяства і гандлю ў ВКЛ у XIV–XV стст.:**
1) гандаль ажыццяўляўся па буйных рэках і сухапутных шляхах;
2) у канцы XV ст. у ВКЛ пачалі ўзнікаць першыя цэхавыя арганізацыі;
3) большая частка рамеснікаў арыентавалася на рынак;
4) знешнім гандлем займаліся заможныя купцы – госці;
5) унутраны гандаль быў прадстаўлены ў форме магазінаў і крам.

***Адказ запішыце лічбамі (парадак запісу лічбаў не мае значэння). Напрыклад:* 123.**

**В8.** Запазычанне або насаджэнне польскай культуры і польскай мовы – **гэта _________.**

***Адказ запішыце словам у форме назоўнага склону.***

**В9. Вызначце характэрныя рысы сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі ў другой палове XVII – XVIII ст.:**
1) адкрыццё першай чыгуначнай лініі на тэрыторыі Беларусі;
2) з’яўленне рынку рабочай сілы;
3) развіццё магнацкага прадпрымальніцтва;
4) з’яўленне новых шляхоў зносін – каналаў;
5) устанаўленне 20-гадовага тэрміну пошуку збеглых сялян.

***Адказ запішыце лічбамі (парадак запісу лічбаў не мае значэння). Напрыклад:* 123.**

**B10. Устанавіце паслядоўнасць падзей, якія адбыліся ў XIII–XVIII стст.**

1) Прынящце «Уставы на валокі» – асноўнага дакумента аграрнай рэформы (валочнай памеры);
2) стварэнне Эдукацыйнай камісіі;
3) заключэнне Брэсцкай (Берасцейскай) царкоўнай уніі;
4) выданне І. Гутэнбергам першай друкаванай кнігі ў Еўропе;
5) каранацыя Міндоўга.

*Адказ запішыце лічбамі. Напрыклад:* **12345.**

**B11. Вызначце характэрныя рысы капіталізму:**

1) уласнасць на зямлю – аснова грамадскіх адносін;
2) асноўныя сацыяльныя групы: буржуазія і наёмныя рабочыя;
3) панаванне таварнай гаспадаркі;
4) асабістая залежнасць вытворцы ад уласніка зямлі;
5) імкненне да прыбытку.

*Адказ запішыце лічбамі (парадак запісу лічбаў не мае значэння). Напрыклад:* **123.**

**B12. Устанавіце адпаведнасць.**

| Гістарычная асоба | Характарыстыка |
|---|---|
| А) К. Семяновіч<br>Б) М. Пачобут-Адляніцкі<br>В) К. Маркс<br>Г) Дж. Уат | 1) стваральнік паравой машыны<br>2) адзін з заснавальнікаў навуковага сацыялізму<br>3) вучоны-прыродазнаўца, дырэктар Віленскай абсерваторыі, рэктар Галоўнай школы ВКЛ<br>4) англійскі фізік, стваральнік першай мадэлі электрарухавіка<br>5) упершыню ў Еўропе сістэматызаваў і апісаў прылады і апараты ў галіне артылерыі ў працы «Вялікае мастацтва артылерыі» |

***Адказ запішыце ў выглядзе спалучэння літар і лічбаў, захоўваючы алфавітную паслядоўнасць літар левага слупка. Памятайце, што некаторыя даныя правага слупка могуць не выкарыстоўвацца. Напрыклад:*** **А1Б4В3Г5.**

**B13.** Гуманітарная дысцыпліна, аб’ектам вывучэння якой з’яўляецца Беларусь, яе гісторыя, традыцыі, культура, сацыяльнае жыццё і г. д., – **гэта ____________.**

***Адказ запішыце словам у форме назоўнага склону.***

**B14. Адзначце дату *(год)* падзеі, якая адбылася *першай* сярод пералічаных:**

1) заканчэнне Першай сусветнай вайны;
2) стварэнне Свяшчэннага саюза;
3) стварэнне суполкі «Гоман» у Пецярбургу;
4) адкрыццё першага ў свеце кінатэатра ў Парыжы;
5) Полацкі царкоўны сабор.

***Адказ запішыце ў выглядзе чатырохзначнага ліку. Напрыклад:*** **1900.**

**B15. Выкарыстоўваючы картасхему «Айчынная вайна 1812 г. на тэрыторыі Беларусі», вызначце правільныя сцверджанні.**




1) Войскамі 1-й заходняй арміі камандаваў Багарнэ.
2) У 1812 г. адбылася буйная бітва на р. Бярэзіне пад Барысавам.
3) Абарона Бабруйска адбывалася ў жніўні – верасні 1812 г.
4) У раёне Полацка разгарнулася сялянскае супраціўленне.
5) Подступы да Вільні абараняла 2-я заходняя армія пад камандаваннем П. І. Баграціёна.

***Адказ запішыце лічбамі (парадак запісу лічбаў не мае значэння). Напрыклад:*** **12.**

**B16. Устанавіце адпаведнасць.**

| Гістарычная асоба | Характарыстыка |
|---|---|
| А) В. Ластоўскі<br>Б) І. Насовіч<br>В) І. Грыгаровіч | 1) выдаў першы абагульняльны нарыс «Кароткая гісторыя Беларусі»<br>2) прафесар Віленскага ўніверсітэта, зрабіў даступнымі для даследчыкаў шэраг важных пісьмовых помнікаў, у тым ліку кнігі Ф. Скарыны<br>3) аўтар-укладальнік першага фундаментальнага «Слоўніка беларускай гаворкі»<br>4) падрыхтаваў і апублікаваў першы зборнік дакументаў па гісторыі Беларусі – «Беларускі архіў старажытных грамат» |

***Адказ запішыце ў выглядзе спалучэння літар і лічбаў, захоўваючы алфавітную паслядоўнасць літар левага слупка. Памятайце, што некаторыя даныя правага слупка могуць не выкарыстоўвацца. Напрыклад:*** **А1Б3В4.**

**B17.** II Усерасійскі з'езд Саветаў рабочых і салдацкіх дэпутатаў адбыўся **ў кастрычніку _____ года**.

*Адказ запішыце ў выглядзе чатырохзначнага ліку. Напрыклад:* **1900.**

**B18. Вызначце характэрныя рысы сацыяльна-эканамічнага і палітычнага развіцця Заходняй Беларусі ў 1921–1939 гг.:**

1) надзяленне беларускіх сялян вялікімі зямельнымі ўчасткамі;
2) павелічэнне працягласці рабочага дня да 10–12 гадзін на суткі;
3) заахвочванне распаўсюджвання праваслаўя і ўніяцтва;
4) закрыццё беларускіх школ і гімназій;
5) адсутнасць арганізаванага нацыянальна-вызваленчага руху.

*Адказ запішыце лічбамі (парадак запісу лічбаў не мае значэння). Напрыклад:* **12.**

**B19.** Культурныя пераўтварэнні ў СССР у 1920–1930-я гг., звязаныя з ліквідацыяй непісьменнасці, стварэннем новай савецкай школы, падрыхтоўкай кадраў народнай інтэлігенцыі, развіццём навукі, літаратуры, мастацтва, атрымалі назву **«культурная _______»**.

*Адказ запішыце словам у форме назоўнага склону.*

**B20. Вызначце характэрныя рысы грамадска-палітычнага жыцця БССР у другой палове 1960-х – першай палове 1980-х гг.:**

1) фарміраванне ўнутрыпартыйнай апазіцыі;
2) абмежаванне правоў і магчымасцей кіраўніцтва рэспублікі;
3) будаванне знакавых помнікаў, прысвечаных Вялікай Айчыннай вайне;
4) правядзенне Усебеларускіх народных сходаў;
5) прыняцце Канстытуцыі БССР.

*Адказ запішыце лічбамі (парадак запісу лічбаў не мае значэння). Напрыклад:* **123.**

**B21.** Першы Усебеларускі народны сход адбыўся ў Мінску **ў _____ годзе**.

*Адказ запішыце ў выглядзе чатырохзначнага ліку. Напрыклад:* **1900.**

**B22. Устанавіце паслядоўнасць падзей, якія адбыліся ў другой палове XX – першай чвэрці XXI ст.**

1) Выбранне М. С. Гарбачова Прэзідэнтам СССР;
2) стварэнне Еўрапейскай эканамічнай супольнасці (ЕЭС);
3) падпісанне дэлегацыяй БССР Статута ААН;
4) аварыя на Чарнобыльскай АЭС.

*Адказ запішыце лічбамі. Напрыклад:* **1234.**